**ДзУК «Пінская гарадская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”**
Сектар краязнаўства цэнтральнай бібліятэкі
Інфармацыйна-бібліяграфічны сектар цэнтральнай бібліятэкі

# *ШУБІТЫДЗЕ ІВАН ГЕОРГІЕВІЧ*



*(да 110-годдя з дня нараджэння аднаго з кіраўнікоў партызанскага руху ў Пінскім раёне ў Вялікую Айчынную вайну)*

шорт-ліст

Пінск, 2016

**Шубітыдзе Іван Георгіевіч**, нарадзіўся 23 лістапада 1906 года ў весцы Келецi Хашурскага раёна Грузіі. Тут жа атрымаў пачатковую адукацыю. Хацеў далей вучыцца, але магчымасці такой у царскі час не ўяўлялася. І толькі Вялікі Кастрычнік адкрыў для яго шырокую дарогу да ведаў.

Дапытлівы, энергічны, ён адным з першых у вёсцы ўступіў у рады Ленінскага камсамола. Як камсамолец, паказаў прыклад працавітасці, адрозніваўся мэтанакіраванасцю. Так, з дзіцячых гадоў, імкнуўся стаць ваенным. І ў 1928 годзе сваю мару ажыццявіў.

Праз год чырвонаармеец І. Г. Шубітыдзе пасля заканчэння вучобы ў пачатковай школе накіроўваецца для праходжання далейшай службы ў стралковы полк Першай грузінскай дывізіі на пасаду намесніка камандзіра ўзвода. Партыйная арганізацыя прымае яго ў свае шэрагі.

У 1931 годзе паступіў у Тбіліскае ваеннае вучылішча на артылерыйскае аддзяленне, якое скончыў у 1934 годзе.

Некалькі гадоў быў камандзірам узвода ў Першым грузінскім артылерыйскім палку. Затым, у сувязі з ліквідацыяй нацыянальных фарміраванняў, пераведзены ў Паўночна-Каўказскую ваенную акругу на пасаду камандзіра батарэі, пазней – начальніка артылерыі 457 стралковага палка 127 дывізіі.

Вялікая Айчынная вайна застала яго пад Смаленскам. Дзень 8 жніўня 1941 года стаў для яго фатальным. Пры адбіцці жорсткай фашысцкай атакі, паранены і кантужаны, І. Шубітыдзе трапіў у палон. У верасні таго ж года таварны чыгуначны састаў вёз савецкіх ваеннапалонных у глыб Нямеччыны. Сярод іх знаходзіўся Іван Георгіевіч Шубітыдзе. Пад грук колаў яго думка адчайна працавала: як збегчы? І на тэрыторыі Польшчы на поўным ходу ён выскачыў з вагона.

Уцёк быў удалым. Неўзабаве ён апынуўся ў шэрагах польскіх байцоў супраціўлення, якія дапамаглі яму пераправіцца праз Буг.

У пачатку 1942 года сфарміраваў і ўзначаліў атрад імя Арджанікідзе. Пад яго кіраўніцтвам народныя мсціўцы ўмела дзейнічалі ў тыле ворага, наносілі нечаканыя і адчувальныя ўдары па гітлераўцам. З арганізацыяй Пінскай партызанскай брыгады быў прызначаны яе камандзірам. Вось што пісала летам 1943 года лясная партызанская газета: “Падраздзялення партызан пад агульным камандаваннем камандзіра Ш. у баі з карным атрадам гітлераўцаў ля вёсак Перахрэсце і Кончыцы нанеслі яму зруйнавальны ўдар, прымусіўшы звярнуцца ва ўцёкі. На полі бітвы фашысцкія ваякі пакінулі каля 60 забітых, шмат стралковага ўзбраення. Карнікі замовілі сабе з’яўляцца ў партызанскай зоне…”

Даверaная яму брыгада з’явілася вялікай ваеннай сілай. Яна складалася з сямі атрадаў. У два з іх ўваходзілі адны палякі. Усяго пад яго кіраўніцтвам знаходзілася больш за пяць тысяч партызан. Да канца баявых дзеянняў І. Г. Шубітыдзе за мужнасць і гераізм быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, двух ордэнаў Чырвонай Зоркі і шматлікіх медалёў. Узнагароджаны таксама ордэнам і медалямі Польскай Народнай Рэспублікі, у

сувязі з 70-годдзем – Ганаровай граматай Прэзідымума Вярхоўнага Савета БССР.

Пасля выгнання нямецка-фашыскіх захопнікаў з тэрыторыі Беларусі Івана Георгіевіча партыйныя органы прызначаюць начальнікам Пінскага абласнога ўпраўлення мясцовай прамысловасці. На гэтай пасадзе ён з уласцівымі яму энергіяй і настойлівасцю займаецца пытаннямі аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі Піншчыны. Пазней на гэтай пасадзе знаходзіўся ў Віцебскім аблвыканкаме, адкуль пайшоў на пенсію.

Апошнія гады Шубітыдзе пражываў у Тбілісі. Нягледзячы на цяжкую хваробу, пісаў свае ўспаміны. Плод гэтай працы – аповесць “Палескія былі”. У 1974 годзе яму было прысвоена званне “Ганаровы грамадзянін горада Пінска”. У лютым 1978 года Івана Георгіевіча не стала. Назваўшы вуліцу яго імем, удзячныя пінчукі яшчэ раз даказалі, з якой павагай яны ставяцца да адважнага сына грузінскага народа.


1. Шубитидзе, Иван Георгиевич. Полесские были : : о совместной борьбе польских и белорусских партизан против фашизма / И. Г. Шубитидзе ; литературная запись Р. Нехая. — Минск : Беларусь, 1974. — 272 с. — (Мемуары).

2. Долготович, Борис Дмитриевич. Почетные граждане белорусских городов : биогр. справочник : [г. Брэст, г. Баранавічы, г. Бяроза, г. Давыд-Гарадок, г. Іванава, г. Івацэвічы, г. Камянец, г. Кобрын, г. Косава, г. Лунінец, г. Ляхавічы, г. Маларыта, г. Мікашэвічы, г. Пінск, г. Пружаны, г. Столін, г. п. Шарашова] / Б. Д. Долготович. — Минск : Беларусь, 2008. — С. 368 с.

3. Шубітыдзе Іван Георгіевіч : партызанскія камандзіры // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Пінска. — Мінск : БЕЛТА, 1998. — С. 274.

4. Лобко, М. За нашу Отчизну! : [об освобождении Пинщины от немецко-фашистских захватчиков во время Великой Отечественной войны и деятельности Пинской партизанской бригады] / Михаил Лобко // Полесская правда. — 2015. — 2 июля (№ 52). — С. 4.

5. Почетные граждане Пинска : Шубитидзе Иван Георгиевич // Варяг-пресс. — 2015. — 23 января (№ 4). — С. 4.

6. Улица имени И. Шубитидзе : [ о командире Пинской партизанской бригады Иване Георгиевиче Шубитидзе ; Почетный гражданин г. Пинска] // Пінскі веснік. — 2015. — 20 сакавіка (№ 23). — С. 2.

7. Борисов, Д. Командир бригады : [о командире Пинской партизанской бригады Иване Георгиевиче Шубитидзе ; Почетный гражданин г. Пинска] / Д. Борисов // Пінскі веснік. — 2002. — 28 чэрвеня. — С. 3.

8. Шубитидзе И. Г. : [некролог] // Полесская правда. — 1978. — 17 января.

9. Шубитидзе Иван Георгиевич : [ о командире Пинской партизанской бригады Иване Георгиевиче Шубитидзе ; Почетный гражданин г. Пинска] // Полесская правда. — 1974. — 30 мая.

10. Шубитидзе Иван Георгиевич (1906 - 1978) [Электронный ресурс] : Почетные граждане Пинска // официальный сайт Пинского горисполкома. — Режим доступа: http://archive.ec/j8px6#selection-1157.0-1177.11

Выканаўцы: Літвінчык В.К., бібліятэкар II катэгорыі аддзела абслугоўвання і і інфармыцыі ЦБ
Гарачова А.Н., галоўны бібліёграф аддзела абслугоўвання і і інфармыцыі ЦБ
лістапад, 2016